# ЮБІЛЕЙНЫЯ ЧЫТАННІ

14 чэрвеня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыліся юбілейныя XX Гарэцкія чытанні.

З уступным словам выступіла дырэктар музея Лідзія Макарэвіч. Прысутныя хвілінай маўчання ўшанавалі памяць Віталя Скалабана, Святланы Явар, Уладзіміра Конана.

З натхнёнымі прывітаннямі да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся славуты паэт Генадзь Бураўкін, пісьменніца і журналіст Людміла Рублеўская, а таксама пісьменнік, галоўны рэдактар газеты "Звязда" Алесь Карлюкевіч.

На пленарным пасяджанні старшынствавалі акадэмік НАН Беларусі Радзім Гарэцкі і кандыдат філалагічных навук Тарэза Голуб. З дакладамі выступілі Радзім Гарэцкі, Таццяна Дасаева, Тарэза Голуб, Роза Зінава. Вельмі цікавым быў выступ Ганны Запартыкі пад назвай "Максім Гарэцкі ва ўспамінах сучаснікаў". Усяго ў канферэнцыі прынялі ўдзел каля 35 даследчыкаў з Менска, Берасця, Віцебска, Беразіно. У другой палове дня даследчыкі падзяліліся па секцыях. Цікава было паслухаць кітаянку Гун Лі з дакладам "Вобразы харавой ды інструментальнай музыкі ў апавяданні М.І. Гарэцкага "Страшная песня", а таксама выступы Дзіны Дудзінскай, Святланы Сычовай, Алёны Садоўскай, Тамары Тарасавай, Евы Лявонавай, Генадзя Кажамякіна, Вольгі Уткевіч, Зоі Траццяк, а таксама Вольгі Козіч.



Трэба сказаць, што ўсе прысутныя сфатаграфаваліся на лесвіцы музея разам з Радзімам Гарэцкім і Генадзем Бураўкіным. І яшчэ варта адзначыць, што чытанні прайшлі ў творчай атмасферы. Было вельмі цікава.

Прысутныя мелі таксама магчымасць набыць кнігі, прысвечаныя жыццю братоў Гарэцкіх.

*Аляксей Шалахоўскі,*
*гісторык культуры,*
*журналіст.*